Умер он, вероятно, до 1671 г., когда пожар уничтожил деревянный Успенский храм, описанный агиографом как действующий [11, с. 29].

В лице агиографа мы видим не только инока, почитавшего преп. Трифона, но и небесталанного писателя, и в каком-то отношении одного из первых вятских историков. Он собирал свидетельства очевидцев и документы, преломляя их через собственный духовный опыт. Благодаря предисловию автора мы видим, как создавалось это произведение, откуда он узнавал те или иные факты. Важно отметить, что, несмотря на некоторые ошибочные сведения и неточности, описание исторических фактов в житии Трифона Вятского в целом подтверждается другими источниками того времени (грамотами, дозорными, писцовыми и оброчными книгами, записями на книгах и иконах, другими житиями и т.д.), что свидетельствует о его достаточно высокой степени достоверности. Когда агиограф в чем-то сомневался, честно признавался читателю: «не вем» – не знаю точно, так ли было или нет. В этом отношении даже В. О. Ключевский, который подчеркивал «стереотипность», «каноничность» житийной литературы, был вынужден признать, что в житии преподобного Трифона агиограф «излагает его биографию простодушно и откровенно, не заботясь о том, в каком свете изображает Трифона его рассказ» [8, с. 282]. И в этом его особая значимость жития для изучения духовной жизни средневековой Вятки.


1. Вятка. Материалы для истории города XVII и XVIII столетий. – [б. м. и.] : Тип. М.Г. Волчанинова, 1887. – 315 с.
2. Вятский Успенский монастырь при преподобном Трифоне: По подлинному документу 1601 г. / предисл., коммент. А. С. Верещагина. – Вятка, 1902.
3. Житие и жительство и отчасти чудеса Преподобного и Богоносного отца нашего Трифона / публ. В. Я. Струминского // Труды Пермской ученой архивной комиссии. – 1905. – Вып. IX. – С. 37–80.
4. Житие и подвизи и отчасти чюдеса преподобнаго отца нашего Трифона Вятцкаго чюдотворца, начальника обители Успения Пресвятыя Богородицы, яже есть близ града Хлынова» / подготовка текста и предисловие И. М. Осокина // Труды Вятской ученой архивной комиссии. – 1912. – Вып. 1–2. – Отд. 2. – С. 1–110.
5. Житие преп. Трифона // Научно-исследовательский отдел рукописей Российской государственной библиотеки (НИОР РГБ). – Ф. 595. № 6.
6. Житие преп. Трифона Вятского // Сектор рукописной книги научной библиотеки Вятского государственного университета (СРК НБВятГУ). – №101218.
7. Житие преподобнаго отца нашего Трифона архимандрита, Вятскаго чудотворца / предисл. П. Д. Шестакова. – Казань, 1868.
8. Ключевский, В. О. Древнерусские жития святых как исторический источник / В. О. Ключевский. – М., 2003.
9. Прохоров, Г. М. Пахомий Серб (Логофет) [Электронный ресурс] / Г. М. Прохоров // Словарь книжников и книжности Древней Руси / АН СССР. ИРЛИ ; отв. ред. Д. С. Лихачёв. – Режим доступа: http://lib.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=4505. – Дата доступа: 12.03.2023.
10. Прохоров, Г. М. Епифаний Премудрый [Электронный ресурс] / Г. М. Прохоров // Словарь книжников и книжности Древней Руси. – Режим доступа: https://web.archive.org/web/20100326220532/http://www.pushkinskijdom.ru/Default.aspx?tabid=3853. – Дата доступа: 12.03.2023.
11. Повесть о стране Вятской / сост. А. Спицын. – Киров, 1993.
12. Российский государственный архив древних актов (РГАДА). – Ф. 1209. Оп. 1. Кн. 1030.
13. Синодик Успенского Трифонова монастыря XVII–XVIII вв. // Кировский объединённый краеведческий музей. – № 3789.
14. Федотов, Г. П. Святые Древней Руси [Электронный ресурс] / Г. П. Федотов. – Режим доступа: https://katehеo.ru/library/books-for-missionaries/svjatye-drevnei-rusi. – Дата доступа: 12.03.2023.



**Глінскі Я.С.**


## ВЫВАДЫ ШЛЯХЕЦТВА ЗЯМЯНАМІ СЛУЦКАГА І КАПЫЛЬСКАГА КНЯСТВАЎ У XVII–XVIII СТСТ.: ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ І ВЕРЫФІКАЦЫЯ ЗВЕСТАК

У XVI–XVIII стст. некаторыя шляхецкія роды Вялікага Княства Літоўскага вымушаны былі ажыццяўляць «вывады» – расшукваць і падаваць на разгляд судоў або павятовых соймікаў доказы, якія пацвярджалі б іх прыналежнасць да вышэйшага саслоўя. Ужо Статут ВКЛ 1529 г. прадугледжваў, што ў выпадку, калі кагосьці абвінавацяць у прысвойванні шляхецкай годнасці, ён павінен прадставіць асоб, якія засведчылі бы яго паходжанне па лініі бацькі і маці [13, с. 50]. Справы аб прысвойванні («нагане») шляхецтва не былі рэдкасцю, многія з іх захаваліся ў складзе Метрыкі ВКЛ.

Найбольш часта вымушана была рабіць вывады дробная шляхта. Асабліва востра праблема пацвярджэння прыналежнасці да вышэйшага стану стаяла перад зямянамі – залежнай шляхтай, якая служыла буйным панам (перш за ўсё, несла ваенную службу ў іх харугвах) і атрымлівала за гэта ў карыстанне зямлю. У дадзеным артыкуле будуць разгледжаны выпадкі доказу зямянамі шляхецтва на прыкладзе Слуцкага і Капыльскага княстваў – буйной латыфундыі, якая да канца XVI ст. з'яўлялася вотчынай князёў Алелькавічаў, а затым перайшла ў валоданне роду Радзівілаў.

Зямянская супольнасць Слуцкага і Капыльскага княства мела даволі стракаты характар. У шэрагі мясцовых зямян, акрамя выхадцаў з паўнапраўнай павятовай шляхты, у XVII–XVIII стст. траплялі прадстаўнікі мяшчанскага і сялянскага саслоўяў. Сярод апошніх да зямянскага статусу найчасцей павышаліся баяры – сяляне-слугі, якія займаліся дастаўкай грузаў і карэспандэнцыі (так званыя «путныя і лістоўныя баяры»), а таксама маглі, як і зямяне, выконваць ваенную павіннасць

(«панцырныя баяры»). Такія «нядаўнія» зямяне не валодалі несумненнымі доказамі прыналежнасці да шляхецкага стану, што магло паслужыць дадатковым аргументам для абвінавачвання ў нешляхецтве падчас судовых працэсаў. У 1670 г. зямян Міхалоўскіх абвінавацілі ў прысвойванні шляхецкай годнасці суседзі па засценку Лаўравічы (Старчыцкі двор Слуцкага княства) Пантусевічы [3, арк. 266; 14, k. 35]. Да войнаў сярэдзіны XVII ст. Міхалоўскія (у гэты час яны часцей ужывалі патранімічныя формы прозвішчаў – Міхайловічы і Міхалкевічы) былі баярамі ў маёнтку Старыца Капыльскага княства і выразна адасабляліся ад мясцовых зямян [2, арк. 332 адв.]. Пасля войнаў яны замацаваліся ў зямянскім асяроддзі. У 1668 г. Фёдар Міхалкевіч (Міхайловіч) падаў супліку на імя тагачаснага ўладальніка Старыцы князя Багуслава Радзівіла наконт таго, што іх няслушна не прызнаюць зямянамі. Насуперак звесткам інвентара ад 1646 г. радзівілаўскія камісары Георг Ёган Бярновіч і Самуэль Уладзіслаў Вішнеўскі прыраўнялі іх да іншых зямян [16, k. 73, 83]. Паказальна, што прыкладна ў гэты час яны сталі выкарыстоўваць больш «шляхетны» варыянт свайго прозвішча – Міхалоўскія. Аднак, верагодна, баярскі радавод Міхалоўскіх не з'яўляўся сакрэтам для іншых зямян – не толькі старыцкіх, але і тых, якія пражывалі побач з Міхалоўскімі ў іншых маёнтках на Случчыне.

Матэрыялы судовых працэсаў аб «нагане шляхецтва» адлюстроўваюць таксама больш складаныя трансфармацыі ў межах сацыяльных груп баяр і зямян. У 1678 г. адбыўся канфлікт паміж жыхарамі вёскі Балотчыцы (Іванскі двор Слуцкага княства) Лабейкамі і Корбутамі. Сярод іншага, Корбутам было выстаўлена абвінавачанне ў нешляхецтве. У адказ на гэта яны падалі наступныя дакументы: ліст князя Юрыя II Юр'евіча Алелькавіча ад 1548 г. да баславіцкага намесніка, каб ён не чыніў крыўдаў і не накіроўваў «у дарогу» Корбутаў, бо яны шляхта; дэкрэт удавы Юрыя II Кацярыны Тэнчынскай ад 1578 г., якім Корбутам была прысуджана зямля ў маёнтку Грозава на рацэ Вужа [11, арк. 351–352 адв.]. Першы з гэтых дакументаў сведчыць пра тое, што ўжо ў сярэдзіне XVI ст. статус Корбутаў не быў дакладна вызначаным. Яны мелі шляхецкае паходжанне, але мясцовая адміністрацыя Слуцкага княства (насуперак нават княжацкай волі) успрымала іх як лістоўных баяр. Неадназначнасць становішча Корбутаў пацвярджаецца і іншымі дакументамі. У інвентары ад 1565 г. яны ў вялікай колькасці прадстаўлены сярод баяр сяла Вужа. Аднак паходзілі яны са слонімскай шляхты. У 1532 г. Пётр Корбут атрымаў прывілей Жыгімонта I на пустаўшчыну Брыкаўскую ў Слонімскім павеце, у 1538 г. той жа Пётр паступіў на службу да князя Юрыя I Сямёнавіча Алелькавіча і атрымаў зямлю на рацэ Вужа [10, арк. 52–52 адв.; 11, арк. 473–473 адв.; 12, с. 333–339, 483, 492, 505]. Таму іх шляхецкі радавод з'яўляўся добра падмацаваным, што і было адлюстравана ў вывадзе ад 1678 г.

Звесткі вывада Корбутаў дастаткова верагодныя, але не варта безумоўна давяраць інфармацыі, занатаванай у зямянскіх вывадах XVII–XVIII стст. У 1669 г. яшчэ адны выхадцы з сяла Вужа [15, k. 324–325] Жоўрыды (Жаўрыды) вялі працэс супраць Казіміра Багінскага, які абвінаваціў іх у незаконным прыўлашчванні шляхецкай годнасці. Вытокі гэтай справы таксама насілі побытавы характар – К. Багінскі збіў зямяніна Мікалая Жоўрыда і не хацеў выплочваць за гэта кампенсацыю як за збіццё шляхціца. У якасці самага ранняга дакумента М. Жоўрыд падаў выпіс з Навагрудскага земскага суда ад 16 лютага 1604 г. аб актыкацыі ліста князя Юрыя I Алелькавіча ад 1530 г. віцебскаму баярыну Паўлу Жоўрыду «на засценак пры рацэ Вужы» [4, арк. 38–39, 47–49 адв.]. Аднак яго змест выклікае пэўныя сумненні. Перш за ўсё, называнне зямельнага надзелу «засценкам» было неўласціва для дакументаў да часоў «валочнай памеры». Апрача таго, 1530 г. – гэта 3-і, а не 12-ы (як пазначана ў выпісе) індыкт. Факт існавання гэтага прывілея цалкам адмаўляць нельга, але, верагодна, ён быў інтэрпаляваны ў XVII ст. (дададзена згадка пра віцебскае паходжанне Жоўрыдаў). Праўка тэксту магла спатрэбіцца якраз падчас працэсаў аб «нагане шляхецтва». У сярэдзіне XVII ст. Жоўрыды неаднаразова траплялі ў іх. У самім дэкрэце па справе супраць К. Багінскага занатавана, што сваё паходжанне даказвалі бацька і брат Мікалая. Магчыма, бацькам Мікалая быў Пратас, які ў 1636 г. атрымаў пасведчанне жыхароў Слуцкага княства і Навагрудскага ваяводства аб шляхецкім паходжанні з прычыны проціleглага сцвярджэння, выказанага Рыгорам Трасейкам-Лазоўскім [4, арк. 48, 63]. Відавочна, што тады таксама адбываўся вывад шляхецтва Жоўрыдамі, матэрыялы якога не захаваліся.

Калі разгледжаныя вышэй зямянскія роды пры вывадзе шляхецтва ў Слуцкім замкавым судзе абапіраліся на наяўныя ў іх родавыя дакументы (рознай ступені верагоднасці), то Мастовічы, якія пераважна пражывалі ў засценку Дошнава Вызненскага двара [8, арк. 63–63 адв.], выкарысталі іншы спосаб доказу. Абвінавачаныя ў 1685 г. у нешляхецтве Ежы Крукоўскім яны звярнуліся да Мастовічаў з Жамойцкага княства, якія выдалі слуцкім зямянам два пасведчанні (у 1685 і 1686 г.) аб супольным шляхецкім паходжанні [6, арк. 1–3; 9, арк. 476–478 адв.]. У пасведчаннях, сярод іншага, выкладаўся радавод слуцкай галіны Мастовічаў, выстаўлялася, што яны паходзілі з Медынгянскай воласці («поля») у Жамойці. Сярод жамойцкіх шляхецкіх родаў сапраўды фігуравалі Мастовічы [17, s. 237–242]. Аднак немагчыма ні ўпэўнена пацвердзіць, ні абгрунтавана абвергнуць агульны радавод медынгянскіх і слуцкіх Мастовічаў.

У 1668 г. Слуцкі замкавы суд разглядаў справу, ініцыяваную зямянінам Янам Казарыным. Ён абвінаваціў у нешляхецтве зямян Чарнышэвічаў з вёскі Касынічы (Старчыцкі двор Слуцкага княства). Кантэкст гэтай справы, як і большасці судовых працэсаў аб прысвойванні шляхецтва, быў побытава-крымінальным, Ян Казарын збіў сыноў Івана Чарнышэвіча Рамана і Лаўрына і не хацеў за гэта плаціць грашовую кампенсацыю. У адказ на абвінавачанне Чарнышэвічы падалі прывілей князя Юрыя ІІ Алелькавіча продку роду Івану Чарнышу, выдадзены ў 1576 г. Паводле яго, Чарнышэвічам надаваліся пяць валок ва ўрочышчы Касынічы з умовай нясення земскай ваеннай службы [7, арк. 21–26 адв.]. Выклікаюць сумненні акалічнасці, выкладзеныя ў наданні. Жыхары Касынічаў былі пераведзены з баярскай путнай на зямянскую ваенную павіннасць толькі ў 1626 г. [15, k. 301], у той жа час сцвярджалася, што продак Чарнышэвічаў атрымаў зямлю на ўмовах ажыццяўлення ваеннай службы ўжо ў 1576 г. Магчыма, згадка пра ваенны (шляхецкі) характар павіннасцей Чарнышэвічаў была дададзена ў дакумент пазней.

У рэдкіх выпадках пацвярджэнне шляхецтва нават у другой палове XVII ст. магло адбывацца на падставе вусных сведчанняў. Зямянскі харужы вёскі Сорагі (Урэцкі двор Слуцкага княства) Марцін Масакоўскі ў 1679 г. быў абвінавачаны ў нешляхецтве зямянамі Мохартамі. Тады ён падаў на імя генеральнага аканома Слуцкага княства Казіміра Крыштафа Клакоцкага супліку, дзе выклаў сваё паходжанне. Марцін сцвярджаў, што яго бацька паходзіў з Плоцкага ваяводства, служыў пад кіраўніцтвам гетмана Хадкевіча, каля 60 гадоў таму прыбыў у Сорагі, дзе ажаніўся. Адзіным знешнім аргументам, які павінен быў пацвердзіць словы М. Масакоўскага, былі сведчанні яго аднавяскоўцаў Шубаў [5, арк. 10–10 адв.]. Выкладзеная Марцінам гісторыя роду не ўтрымлівае відавочных супярэчнасцей. Разгалінаваны шляхецкі род Масакоўскіх сапраўды жыў у гістарычнай Мазовіі [18, s. 296–297], згаданы ў супліцы гетман Хадкевіч – гэта Ян Караль Хадкевіч, які ў пачатку XVII ст. узначальваў войска ВКЛ у вайне супраць Швецыі.

Вывады ажыццяўляліся асобнымі родамі толькі ў выпадку выстаўлення супраць іх абвінавачання ў нешляхецтве, але зямяне вымушаны былі таксама сістэматычна падаваць на праверку радзівілаўскай адміністрацыі дакументы, якія пацвярджалі б іх статус. Пры гэтым далёка не ўсім звесткам пра паходжанне, якія выкладаліся зямянамі падчас падобных рэвізій, варта давяраць.

У рэвізіі 1687 г., у дачыненні да зямяніна з засценка Шылаўшчына (Старыцкі двор) Ежы Адамовіча адзначалася, што ён, «як сцвярджаюць, [паходзіць] з Мінскага ваяводства» [16, k. 66]. Вонкава гэта выглядае даволі верагодным. Шляхецкі род Адамовічаў пражываў у Мінскім ваяводстве [1, с. 90–91]. Аднак у выпадку Ежы Адамовіча сумненні ў яго нетутэйшым паходжанні ўзнікаюць на падставе некалькіх акалічнасцей. У інвентарах 1680-х гг. ён фігураваў на даволі вялікім надзеле (у адну з чвэрцю валоку), але не адзін, а з не названымі пайменна «сябрамі», што магло сведчыць пра тое, што ён меў родзічаў у Старыцы, з якімі супольна трымаў зямянскі надзел. Больш за тое, прозвішча Адамовіч масава сустракалася сярод жыхароў чыншавай вёскі Пырашаўская Слабада [2, арк. 334–335, 466; 16, k. 61]. Магчыма, менавіта адтуль і паходзіў Ежы. У такім выпадку яго сялянскі радавод мог быць прыхаваны апеляцыяй ад паходжання з мінскай шляхты.

Такім чынам, справы аб «нагане шляхецтва» перыяду Рэчы Паспалітай пачыналіся, як правіла, у выніку міжасабовых канфліктаў і не насілі масавага характару. Праблема доказу ўласнага паходжання была вельмі актуальнай для зямян, частка з якіх мела сялянскія і мяшчанскія карані. Пры гэтым у вывадах шляхецтва не ўсе звесткі адпавядалі рэчаіснасці, асабліва гэта тычылася інфармацыі пра найбольш аддаленых продкаў


1. Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 1 : А. – Мінск : БелНДІДАС, 2002. – 493 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 23.
3. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 1. Спр. 36.
4. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1049.
5. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2102.
6. НГАБ. – Ф. 319, Воп. 2. Спр. 2131.
7. НГАБ. – Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3611.
8. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1079.
9. НГАБ. – Ф. 1730. Воп. 1. Спр. 11.
10. НГАБ. – Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 16.
11. НГАБ. – Ф. 1787. Воп. 1. Спр. 2.
12. Статкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш: Статкевічы, Сацкевічы-Статкевічы герба «Касцеша». Карафа-Корбуты герба «Корчак» / А. В. Статкевіч-Чабаганаў. – Мінск : Роднае слова, 2011. – 589 с.
13. Статут Великого княжества Литовского 1529 года / под ред. К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во Академии наук БССР, 1960. – 253 с.
14. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów (AR). Dz. 23. T. 122. Plik. 4.
15. AGAD. – AR. Dz. 23, T. 159. Plik. 2.
16. AGAD. – AR. Dz. 25. Sygn. 4069.
17. Błaszczyk, G. Herbarz szlachty żmudzkiej / G. Błaszczyk. – T. 4. – Warszawa : DiG, 2015. – 697 s.
18. Uruski, S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski. – T. 11. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1914. – 380 s.